Я.Маўр. “Багіра”( 6 клас)

Мэты:
-выклікаць эмацыянальны водгук на твор Я.Маўра; прыгадаць паводзіны Багіры на вуліцы і ў хаце; ацаніць дзеянні людзей, што аказаліся побач з Багірай.
-выхоўваць любоў і пашану да ўсяго жывога на зямлі; падвесці вучняў да думкі, што кожная жывая істота мае права на жыццё.

Ход урока.

I. ***Арганізацыйна-матывацыйны этап.***

- Крыжаванка. “Пазнай героя”

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | | | | | | |
| | | 2 | | | | | | | |
| 3 | | | | | | | | | |
| | | | 4 | | | | | | |
| | 5 | | | | | | | | |
| | | | 6 | | | | | | |

Па гарызанталі:

1. Імя галоўнага героя ўрыўка з аповесці “Паляванне на апошняга Жураўля”. (Бабёр.)
2. Дзеці кошкі. (Кацяняты.)
3. Развіццё, паляпшэнне ў працэсе развіцця. (Прагрэс.)
4. Галоўная гераіня апавядання І.Пташнікава.(Ірка.)
5. Тое, што капаюць бабры.(Норы.)
6. Назва апавядання І.Пташнікава. (Алені.)

Па вертыкалі:

1. Галоўная гераіня апавядання Я.Маўра. (Багіра.)

II. ***Вызначэнне мэты ўрока***:

*Будзем ведаць*:
-змест апавядання “Багіра”;
-галоўных герояў апавядання;

*Будзем умець*:
-характарызаваць герояў, даваць ацэнку іх паводзінам;
-знаходзіць адпаведныя характарыстыкі ў тэксце;

*III. Арыенціровачна-матывацыйны этап. Эўрыстычная гутарка па змесце апавядання.*

- Чаму Я.Маўр назваў апавяданне “Багіра”?

| | | | |
|---|---|---|---|
| ***Багіра***<br><br>Чорная<br>Разумная<br>Кемлівая<br>Самастойная<br>Аўтарытэтная<br>Патрабавальная |  | ***Кошка***<br><br>Чорная<br>Разумная<br>Кемлівая<br>Самастойная<br>Аўтарытэтная<br>Патрабавальная |  |

- ***Аналіз апавядання. Выберыце з воблака слоў якасці характару Багіры і падмацуйце свае думкі цытатамі з тэксту.***






- ***Аналіз паводзін людзей і кошкі.***

Людзі

узялі кошку

назіралі за кошкай і кацянятамі

аддалі кацянят

дзівіліся з паводзін

смяяліся з кацянят




IV.***Кантрольна-карэкцыйны этап*. *Пастаноўка праблемных пытанняў*.**

- Якія перамены адбыліся з кошкай, калі яе дзеці падраслі?
- Чаму кошка пачала шкодзіць гаспадарам?
- Чаму ні дрэсіроўка, ні ўгаворы не дапамаглі дагаварыцца з кошкай?
- Ці можна пагадзіцца са сцвярджэннем: “І цяпер мы шкадуем, што так яе расхвалілі на ўвесь белы свет”.
- Хто аказаўся мудрэйшым:людзі ці кошка?
  - ***Запаўненне блок-схемы***

| Тэма | Ідэя | Сэнс назвы | Пазіцыя аўтара | Жанр твора |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

  - ***Калектыўны падрабязны пераказ апавядання “Багіра”***
  - ***Складанне плана.***
    1.Сустрэча на вуліцы.
    2. Багіра ў хаце.
    3.Каціная сям’я.
    4.Якасці характару Багіры.
    5. Догляд дзяцей.
    6.Шкодніцтва кошкі.
  - ***Складанне сінквейна на аснове воблака слоў..***

Багіра
Смелая, разумная.
Клапоціцца, выхоўвае, працуе.
Самая разумная кошка на зямлі.
Маці.

V.Рэфлексія.

- Мне спадабалася Багіра, таму што…
- Я асуджаю гаспадароў Багіры за …
- Апавяданне вучыць нас…

***Прыём “Далонь”***

-на аркушы паперы абвядзіце сваю далонь. На кожным пальцы запішыце ўласныя адносіны да ўсяго навакольнага.

VI.Выстаўленне і каментаванне адзнак.
VII.Дамашняе заданне.